# МЕМАРАНДУМ

## аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)

Рэспубліка Беларусь і Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА),

улічваючы іх агульнае імкненне да ідэалаў міру, перакананне ў важнасці міжнацыянальнага супрацоўніцтва праз адукацыю, навуку, культуру, камунікацыю і інфарма-

тыку у мэтах далейшага развіцця ўсеагульнага шанавання справядлівасці, вяршэнства закона, правоў чалавека і асноўных свабод;

з задавальненнем адзначаючы, што Мемарандум, падпісаны ў Мінску ў 1997 годзе паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА значна паспрыяў супрацоўніцтву ў галінах адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі, у прыватнасці, рэалізацыі Праграмы ЮНЕСКА–Чарнобыль і праекта па стварэнні цэнтраў сацыяльна–псіхалагічнай рэабілітацыі;

усведамляючы жаданасць далейшага пашырэння ўдзелу Рэспублікі Беларусь у распрацоўцы і рэалізацыі праграм і дзейнасці ЮНЕСКА,

адзначаючы важную ролю Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА ў каардынацыі выпрацоўкі ўкладу інтэлектуальнай супольнасці Беларусі ў дзейнасць ЮНЕСКА і прызнаючы яе патэнцыял у дачыненні да рэалізацыі праграм і дзейнасці ЮНЕСКА ў краіне;

улічваючы ўзрастанне ролі грамадзянскай супольнасці і перавагі ўзмацнення супрацоўніцтва, у прыватнасці, з няўрадавымі арганізацыямі;

падкрэсліваючы важнасць рэгіянальных стратэгій у праграмнай дзейнасці ЮНЕСКА, якія адпавядаюць патрэбам краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы;

зноў пацвярджаючы сваё імкненне ўздымаць узровень і пашыраць супрацоўніцтва і пагадняюцца аб ніжэйвыкладзеным:

*Адукацыя*

1. Рэспубліка Беларусь падтрымлівае дзейнасць ЮНЕСКА, накіраваную на абнаўленне, дыверсіфікацыю і пашырэнне сістэм адукацыі, адукацыйных праграм і працэсаў у межах адукацыі праз усё жыццё і садзейнічае наданню ім большай адпаведнасці сацыяльным пераўтварэнням і выклікам XX стагоддзя. ЮНЕСКА ўзмоцніць садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь ў рэфармаванні сістэмы адукацыі, яе інтэграцыі ў сусветную адукацыйную прастору, а таксама ва ўмацаванні яе патэнцыялу ў мэтах развіцця і правядзення даследванняў у галіне педагагічных навук, што мае на мэце павелічэнне ўкладу адукацыі ў развіццё грамадства, а таксама ў правядзенне іншых відаў дзейнасці ў гэтых мэтах. ЮНЕСКА акажа садзейнічанне ў арганізацыі рэгіянальнай канферэнцыі "Рэфармаванне сярэдняй школы: аналіз адукацыйнай палітыкі ў краінах на пераходным этапе" (Мінск, 1999 год).

2. З улікам, важнасці экалагічнай і прэвентыўнай адукацыі і выхаванні насельніцтва ў духу экалагічнай этыкі Рэспубліка Беларусь мае намер уключыць педагагічную адаптацыю і псіхалагічную рэабілітацыю дзяцей, што знаходзяцца пад уздзеяннем стрэса, прычыненага прыроднымі і тэхналагічнымі катастрофамі, у дзейнасць па гэтым адукацыйным накірунку. Рэспубліка Беларусь гатова падзяліцца з міжнароднай супольнасцю сваім вопытам у гэтай сферы, у прыватнасці, вопытам стварэння цэнтраў сацыяльна–псіхалагічнай рэабілітацыі для пацярпелых ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. ЮНЕСКА ўзмоцніць супрацоўніцтва з кафедрай ЮНЕСКА па радыёэкалогіі, адкрытай у Міжнародным інстытуце радыёэкалогіі імя Сахарава ў Мінску.

3. ЮНЕСКА будзе садзейнічаць рэфармаванню прафесійна–тэхнічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, галоўным чынам, праз Міжнародны праект прафесійна–тэхнічнай адукацыі (ЮНЕВОК), і будзе аказваць падтрымку дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь па абнаўленню і ўдасканаленню навукова–тэхнічнай адукацыі.

4. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць пашыраць супрацоўніцтва для прымянення і развіцця міжнародных нарматыўных інструментаў, што датычыцца прызнання навучальных курсаў, ступеняў і дыпломаў.

5. Прымаючы да ўвагі значэнне, што надаецца адукацыі для ўсталявання культуры міру, талерантнасці, умацавання дэмакратычных прынцыпаў, міжкультурнага паразумення і шанавання правоў чалавека, ЮНЕСКА будзе падтрымліваць дзейнасць кафедры ЮНЕСКА па культуры міру і дэмакратыі, створанай у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, і кафедры ЮНЕСКА па правах чалавека і дэмакратыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў распрацоўцы навучальных праграм, дапаможнікаў для выкладчыкаў і падручнікаў па культуры міру і дэмакратыі.

6. ЮНЕСКА будзе аказваць падтрымку Рэспубліцы Беларусь у садзейнічанні развіццю і выкарыстанню новых інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у адукацыі, у прыватнасці, праз развіццё і ўдасканальванне метадаў дыстанцыйнага навучання і выкарыстання ў гэтых мэтах сістэмы Інтэрнет.

7. ЮНЕСКА будзе садзейнічаць Рэспубліцы Беларусь ва ўмацаванні прэвентыўнай адукацыі ў галіне супрацьдзеяння злоўжыванню наркотыкамі і прафілактыкі СНІД у кантэксце выхавання разумення неабходнасці здаровага ладу жыцця і ўзмацнення грамадскага ўсведамлення гэтай праблемы, у прыватнасці, праз сродкі масавай інфармацыі.

8. Рэспубліка Беларусь будзе пашыраць супрацоўніцтва з Еўрапейскім цэнтрам вышэйшай адукацыі ЮНЕСКА (СЕПЕС) для інтэграцыі яе сістэмы вышэйшай адукацыі ў агульны еўрапейскі кантэкст. Рэспубліка Беларусь, прызнаючы ролю СЕПЕС, што датычыцца садзейнічання і пасрэдніцтва ў супрацоўніцтве паміж краінамі Еўропы ў гэтай галіне, і пацвярджае гатоўнасць да пашырэння свайго ўдзелу ў дзейнасці, звязанай з развіццём акадэмічнага супрацоўніцтва і мабільнасці ў Еўропе і з прызнаннем кваліфікацый у вышэйшай адукацыі.

9. У межах Праекта асацыяваных школ (АСП) ЮНЕСКА будзе садзейнічаць нацыянальным уладам у кансалідацыі і пашырэнні нацыянальнай сеткі асацыяваных школ.

10. Спецыялізаваныя ўстановы ЮНЕСКА, такія, як Міжнароднае бюро асветы (МБА, Жэнева), Міжнародны інстытут планавання адукацыі (МІПА, Парыж), Інстытут інфармацыйных тэхналогій у адукацыі (ІІТА, Масква) і Інстытут адукацыі (ІАЮ, Гамбург, Германія) будуць і надалей развіваць супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі, а таксама спрыяць актыўнаму ўдзелу адпаведных устаноў і кваліфікаваных экспертаў Беларусі.

***Навука***

1. ЮНЕСКА будзе супрацоўнічаць з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і беларускімі ўніверсітэтамі, а таксама іншымі спецыялізаванымі ўстановамі, у прыватнасці, з Асацыяваным цэнтрам па хімічнай і навуковай адукацыі, у мэтах умацавання нацыянальнага патэнцыялу на ўніверсітэцкім узроўні ў галіне выкладання і даследванняў па агульнаадукацыйных і інжынерных дысцыплінах, умацавання рэгіянальнага супрацоўніцтва ў гэтым накірунку, а таксама ў спрыянні выкарыстанню экалагічнабяспечных тэхналогій і аднаўляльных крыніц энергіі і навуковых эксперыментах на мікраўзроўні. У гэтым кантэксце кафедра ЮНЕСКА па энергазахаванню і аднаўляльных крыніцах энергіі Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі будзе і нада-

лей атрымліваць падтрымку з боку Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА.

2. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць супрацоўнічаць ва ўмацаванні сувязей паміж універсітэтамі і прамысловасцю ў галіне інжэнерных навук і садзейнічанні забеспячэнню адпаведнасці тэхнічнай адукацыі і даследванняў патрэбам прамысловасці ў межах Праграмы УНІСПАР.

3. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА ўзмоцняць свае намаганні дзеля спрыяння актыўнаму ўдзелу Рэспублікі Беларусь у рабоце міжурадавых навуковых праграм, разгорнутых пад эгідай ЮНЕСКА, такіх, як Праграма "Чалавек і біясфера" (МАБ), Міжнародная праграма геалагічнай карэляцыі (МПГК) і Праграма "Кіраванне сацыяльнымі пераўтварэннямі" (МОСТ). А менавіта:

а). Рэспубліка Беларусь будзе працягваць міжнароднае рэгіянальнае супрацоўніцтва ў міждысцыплінарных экалагічных даследваннях у межах нацыянальнай і рэгіянальнай дзейнасці па Праграме МАБ, а таксама ў прымяненні Севільскай стратэгіі і статутных палажэнняў Сусветнай сеткі біясферных запаведнікаў;

в). Рэспубліка Беларусь будзе паглыбляць супрацоўніцтва паміж спецыялізаванымі ўстановамі і няўрадавымі арганізацыямі ў рэалізацыі праектаў нацыянальнага і рэгіянальнага маштабу ў межах МПГК;

с). у кантэксце Праграмы МОСТ ЮНЕСКА забяспечыць сваё інтэлектуальнае садзейнічанне прыярытэтным праблемам даследвання у галіне сацыяльных навук, а асабліва ў галінах сацыяльна–эканамічных і палітычных зменаў, сацыяльнай выключанасці і сацыяльнай згоды, праблем міжэтнічных узаемаадносін і развіцця гарадоў.

5. Рэспубліка Беларусь падтрымлівае намаганні ЮНЕСКА, накіраваныя на распрацоўку прынцыпаў сусветнай этыкі і маральнай адказнасці навукоўцаў, у прыватнасці, ў адносінах навакольнага асяроддзя, генома чалавека, а таксама інфармацыі і інфарматыкі.

6. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і ЮНЕСКА будуць супрацоўнічаць у падрыхтоўцы Сусветнай канферэнцыі па навуцы, якая адбудзецца ў г. Будапешце ў 1999 годзе.

***Культура***

1. Рэспубліка Беларусь у сваіх намаганнях па ўмацаванню працэсу выпрацоўкі палітыкі і дзейнасці ў галіне культуры будзе прымаць пад увагу План дзеянняў па культурнай палітыцы дзеля развіцця, прыняты на Міжурадавай канферэнцыі па культурнай палітыцы дзеля развіцця (г. Стакгольм, 1998 г.), з мэтай інтэгравання культурнай палітыкі ў стратэгіі чалавечага развіцця.

2. У галіне аховы і зберажэння культурнай спадчыны ЮНЕСКА будзе садзейнічаць Рэспубліцы Беларусь у захаванні і рэвіталізацыі яе рухомай і нерухомай спадчыны, уключаючы яе гістарычныя і архітэктурныя помнікі, а таксама рэвіталізацыі гістарычнага цэнтра г. Гродна. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць супрацоўнічаць ва ўмацаванні эфектыўнага прымянення Канвенцыі па ахове Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

3. Будуць прымацца ўзмоцненыя намаганні для інтэграцыі працэсу захавання культурнай спадчыны ў эканамічнае і сацыяльнае жыццё краіны. З улікам існуючых умоў у галінах навакольнага асяроддзя, культуры, сацыяльнай сферы і інфраструктуры ў Рэспубліцы Беларусь будуць праводзіцца і актыўна падтрымлівацца праз

ЮНЕСКА праекты дзеля распрацоўкі стратэгіі спалучэння развіцця турызму і рэстаўрацыі культурных каштоўнасцей. ЮНЕСКА таксама акажа падтрымку стварэнню цэнтра падрыхтоўкі ў галіне культурнага турызму ў Мірскім замку.

4. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць прымаць далейшыя намаганні дзеля прадухілення і барацьбы супраць незаконнага перамяшчэння праз межы краіны культурных каштоўнасцей і будуць садзейнічаць вяртанню іх у краіны паходжання. З гэтаю мэтай будзе заахвочвацца эфектыўнае прымяненне палажэнняў адпаведных міжнародных канвенцый. ЮНЕСКА будзе садзейнічаць Рэспубліцы Беларусь ва ўдасканаленні мер бяспекі ў музеях, у захаванні і пашырэнні музейных калекцый, распрацоўцы нацыянальнага заканадаўства, прынящці адміністратыўных мер і нацыянальнай стратэгіі адносна прадухілення і барацьбы супраць незаконнага перамяшчэння культурных каштоўнасцей. ЮНЕСКА будзе садзейнічаць падрыхтоўцы нацыянальных экспертаў у гэтай галіне.

5. ЮНЕСКА будзе працягваць садзейнічаць папулярызацыі беларускай культуры, у прыватнасці, праз публікацыю рэпрэзентатыўных твораў беларускай літаратуры, падтрымку міжнародных культурных абменаў Беларусі, а таксама праз далучэнне да святкавання двухсотгоддзя паэта Адама Міцкевіча.

6. Рэспубліка Беларусь падтрымае намаганні ЮНЕСКА па арганізацыі такіх значных міжнародных форумаў, як Сусветны форум культур у г. Барселоне ў 2004 годзе.

### *Камунікацыя, інфармацыя і інфарматыка*

1. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць супрацоўнічаць у садзейнічанні свабоднаму патоку інфармацыі і развіцці незалежных і плюралістычных сродкаў масавай інфармацыі. ЮНЕСКА акажа падтрымку ў падрыхтоўцы кадраў, стварэнні сучасных інфармацыйных інфраструктур і забеспячэнні доступу да міжнародных камунікацыйных сетак, у прыватнасці, да Інтэрнет. Арганізацыя таксама акажа дапамогу ў распрацоўцы нацыянальнай палітыкі і заканадаўства ў сферы камунікацыі і інфармацыі.

2. ЮНЕСКА будзе падтрымліваць намаганні Рэспублікі Беларусь у далейшым актыўным удзеле ў Міжнароднай праграме развіцця камунікацый (МПРК), Агульнай праграме па інфармацыі (АПІ) і Міжурадавай праграме па інфарматыцы (МПІ).

3. Установы і эксперты Рэспублікі Беларусь будуць працягваць актыўнае супрацоўніцтва з ЮНЕСКА ў развіцці і распаўсюджванні пакета праграм ІДАМС і актывізуюць свой удзел у рабоце Праграмы "Памяць свету".

4. На аснове канцэпцыі "віртуальнай бібліятэкі" будзе распачаты сумесны пілотны праект па падачы выбраных твораў беларускай літаратуры праз Інтэрнет. ЮНЕСКА акажа падтрымку развіццю інфармацыйнай службы "Беларусіка" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у прыватнасці, што датычыцца увядзення новых форм прымянення інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій.

5. Рэспубліка Беларусь і ЮНЕСКА будуць актыўна супрацоўнічаць у рэалізацыі праекта "СТАКСІС", распачатага пад эгідай ЮНЕСКА ў межах Камісіі еўрапейскіх супольнасцей для сямі краін Усходняй Еўропы, і накіраванага на выкарыстанне тэлематыкі ў галінах адукацыі і навуковых даследванняў.

### *Клубы, цэнтры і асацыяцыі ЮНЕСКА*

Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА і ЮНЕСКА будуць садзейнічаць рэактывізацыі значнай нефармальнай сеткі клубаў ЮНЕСКА і будуць падтрымліваць яе дзейнасць, звязаную з развіццём выхавання ў мэтах міру, правоў чалавека, дэмакратыі, талерантнасці, ненасілля і міжнароднага паразумення.

Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА будзе супрацоўнічаць з Сакратарыятам ЮНЕСКА ў мэтах рэалізацыі вышэйназваных відаў дзейнасці і праектаў.

Здейснена ў Мінску 7 верасня 1998 года ў чатырох экземплярах, два з якіх на беларускай і два на англійскай мовах.

За Рэспубліку Беларусь

Сяргей Лінг

Прэм'ер–міністр

За Арганізацыю Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры

Федэрыка Маёр

Генеральны дырэктар